якое магло дасягнуць вышынь танцавальнага майстэрства. Напрыклад, падобныя студыі існуюць у ансамблі "Харошкі", ансамблях танца "Белая Русь", "Карагод", "Зубраня". Усе яны працуюць з улікам узросту ўдзельнікаў, маюць свае накірункі. Студэнт тут выступае ў ролі настаўніка-харэографа. Пералічаныя студыі будуюцца па прынцыпе "ад простага да складанага" ў танцавальным майстэрстве.

Неабходна такія базы, як школы-студыі бальнага альбо народнага танцаў, выкарыстоўваць для праходжання педагагічнай практыкі.

В.В.Лысянкова зазначыла і наступнае. Па сённяшніх установках дэканата кафедра дапускае да педагагічнай практыкі студэнтаў, што маюць па педагогіцы адзнакі "добра" або "выдатна". Лічым, што педагагічную практыку, асабліва па харэаграфічнай спецыялізацыі, павінны прайсці ўсе студэнты, паколькі яны ў асноўным працуюць у дзіцячых калектывах. Трэба, каб кафедра вырашала пытанне, каму са студэнтаў дазволіць праходзіць педагагічную практыку, нягледзячы на адзнакі па педагогіцы.

**Церская Н.С., дацэнт**

## АБ ПАВЫШЭННІ ЭФЕКТЫЎНАСЦІ ПРАКТЫКІ ЯК АДНОЙ З АСНОЎНЫХ ФОРМАЎ МЭТАВАЙ ПРАФЕСІЙНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ СТУДЭНТАЎ

Неабходнасць абмеркавання пытання аб павышэнні эфектыўнасці практыкі, адной з асноўных формаў мэтавай прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў, звязана з тым, што прэстыж прафесійнай адукацыі на сучасным этапе развіцця грамадства няўхільна ўзрастае. Усім галінам, у тым ліку галіне культуры, цяпер патрэбны спецыялісты, якія спалучалі б у сабе высокі інтэлектуальны ўзровень, дзелавыя і арганізацыйныя веды, уменні, навыкі, былі гатовы вырашаць складаныя праблемы вытворчасці.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Практыка, арганізаваная сумеснымі сіламі кафедры і базы-ўстановы, дазваляе плённа вырашаць шэраг задач прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў.

Назавем некаторыя задачы, што практыка як форма навучання здольная вырашаць:

— паглыбленне, прафесійнае асэнсаванне, замацаванне фундаментальных агульнапрафесійных і спецыяльных ведаў, якія патрэбна ўлічваць пры вырашэнні арганізацыйных і метадычных пытанняў вытворчага навучання;

— развіццё здольнасцей, імкнення да самастойнага набыцця ведаў і навыкаў, неабходных для выканання прафесійных абавязкаў;

— фарміраванне навыкаў і ўменняў аперыраваць ведамі, атрыманымі ў працэсе навучання;

— набыццё навыкаў правядзення дыягностыкі, ажыццяўлення назіранняў, аналізу дзейнасці ўстаноў—баз практыкі і выкарыстанне вынікаў у навукова-даследчай рабоце;

— фарміраванне ў студэнтаў патрабавання творчага ўспрымання, асэнсаванне вопыту работы ўстаноў сацыякультурнай сферы;

— падрыхтоўка студэнтаў да самастойнай прафесійнай дзейнасці ва ўстановах культуры, калектывах мастацкай творчасці, навучальных установах.

Практыка арганічна спалучае працэс навучання з вытворчай працай, студэнты ў працэсе практычнага навучання самастойна і пад кіраўніцтвам спецыялістаў набываюць веды, уменні, навыкі працы ў канкрэтных абставінах.

Практыка як форма навучання з'яўляецца вядучай формай замацавання і выкарыстання ведаў. У якасці свядомаснага імкнення яна пераўтварае засвоеныя веды ў перакананне, уменне рэалізаваць іх у практычнай дзейнасці.

Акрамя таго, сутыкнуўшыся на базах практыкі з творчымі працэсамі, студэнты могуць адчуць недахоп ведаў. Таму добра арганізаваная практыка, калі працягваецца ўвесь тэрмін навучання, матывуе пазнавальную дзейнасць, арыентуе студэнта

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

на актыўнае засваенне вывучаемага матэрыялу розных дысцыплін.

Вырашэнне пералічаных задач залежыць ад таго, як арганізавана практыка, які ў яе змест, якая тэхналогія праходжання практыкі, хто кіруе ёю з боку кафедры і базы.

Спынімся на асобных выніках работы па арганізацыі практычнага навучання.

Практыка ва універсітэце ўяўляе сабой сістэму відаў і форм практычных заняткаў, што пастулова ўскладняюцца. Як від вучэбнага працэсу практыка мае спецыфічныя асаблівасці. Прынцыпова тое, што ўмовы пазнавальнай дзейнасці падчас практыкі адрозніваюцца ад звычайных умоў навучання ў ВНУ (калі заняткі рэгламентуюцца раскладам, праводзяцца ў сценах навучальнай установы пад кіраўніцтвам і кантролем выкладчыцкага саставу). Практыка ў базавых установах, творчых калектывах праходзіць у іншых умовах. У яе арганізацыі ўдзельнічаюць і кафедра, і пэўная ўстанова або калектыў.

Вытворчая практыка мае выражаную прафесійную накіраванасць, арганічна ўзаемазвязана з профілем падрыхтоўкі кадраў. Таму яна на кожным этапе навучання адрозніваецца.

На факультэтах існуюць такія віды практыкі, як вучэбная, вытворчая і педагагічная. Пачынаецца яна ў асноўным з другога курса, за выключэннем спецыялізацый "сацыяльная педагогіка", "рэжысура свят", дзе практыка пачынаецца з першага курса.

Штогод каля 75% студэнтаў ахоплены ўсімі відамі практыкі.

Вучэбная практыка ў аўдыторыях, майстэрнях, установах — базах практыкі — уводзіць студэнтаў у прафесію, знаёміць з накірункамі дзейнасці ўстаноў сацыякультурнай сферы. Яна арганізуецца на першых курсах. На наступным этапе студэнты больш падрабязна вывучаюць структуру, арганізацыю работы ўстановы, формы і метады яе дзейнасці, прымаюць ва ўсім гэтым непасрэдны ўдзел. На гэтым этапе фарміруюцца навыкі вырашэння вытворчых праблем. На апошніх курсах мэта практыкі зусім іншая: сістэматызацыя, замацаванне, пашырэнне ведаў па спецыяльнасці, выкарыстанне атрыманых ведаў,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

навыкаў вырашэння задач, што складаюць аснову дыпломнага праекта. Тут студэнты самастойна працуюць над увасабленнем сваіх задум па правядзенні мерапрыемстваў, арганізуюць канцэрты, рэпетыцыі, святы, абрады, вечарыны, канферэнцыі, абагульняюць вопыт работы базы практыкі. Атрыманыя вынікі выкарыстоўваюцца ў працэсе падрыхтоўкі дыпломных, бакалаўрскіх работ.

На ўсіх кафедрах, па ўсіх відах практыкі распрацаваны і зацверджаны праграмы, якія ўдакладняюцца амаль штогод, перад пачаткам чарговай практыкі. На факультэце мастацкай творчасці ёсць скразная праграма вытворчай і педагагічнай практыкі на ўвесь тэрмін навучання. У ёй прадугледжаны пераемны, паступовы характар набыцця студэнтамі практычных навыкаў. Аналагічная праграма распрацавана і кафедрай тэатральнай творчасці факультэта культуралогіі.

На факультэце бібліятэчна-інфармацыйных сістэм праграмы практыкі распрацаваны для кожнага курса. Яны прадугледжваюць вывучэнне тэхналогіі працы бібліятэк і, што важна, папярэдне абмяркоўваюцца з кіраўніцтвам баз практыкі: Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Рэспубліканскай навукова-педагагічнай бібліятэкі, бібліятэкі імя Я.Купалы, дзіцячай бібліятэкі імя М.Астроўскага г.Мінска.

На факультэце культуралогіі па ўсіх спецыяльнасцях распрацаваны практычныя заданні на час практыкі.

Гэтыя заданні даволі змястоўныя. У іх указаны мэты, змест заданняў для кожнага курса, пададзены ўзоры справаздачнай дакументацыі. Да некаторых заданняў маюцца метадычныя распрацоўкі.

На жаль, не ўсе заданні ўзгадняюцца з арганізацыямі, у якіх запланавана правесці практыку. Такое становішча вядзе да разыходжання інтарэсаў студэнтаў і ўстаноў, іх магчымасцей. Гэта зніжае эфектыўнасць вытворчай практыкі, пагаршае якасць дыпломнай работы, зніжае ўзровень прафесійнай падрыхтоўкі.

Пажадана, каб кафедры мелі комплексныя праграмы бесперапыннай прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў на ўвесь тэрмін іх навучання. Падобная скразная комплексная праграма



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аб'ядноўвае ўсе віды практыкі. Яна ўключае змест, тэхналогію, парадак праходжання практыкі, адлюстроўвае цэласную сістэму, спецыфіку практычнай падрыхтоўкі спецыялістаў на розных ступенях навучання, пераемнасць паміж формамі, этапамі практыкі, паступова ўключае студэнта ў сферу вытворчасці. Распрацоўка скразных праграм практыкі на пяць гадоў навучання павінна будавацца з улікам сучасных накірункаў дзейнасці ўстаноў сацыякультурнай сферы. Акрамя таго, праграма — гэта асноўны нарматыўны дакумент, які адлюстроўвае сістэму вытворчага навучання. Аднак трэба заўважыць, што ў ёй не заўсёды ўлічваюцца асаблівасці вытворчых працэсаў баз практыкі.

Распрацоўка скразной праграмы, на жаль, не дапамагае арганізацыі дыферэнцыраванага падыходу да асобных студэнтаў, канкрэтнай базы. Таму ўзнікае неабходнасць у распрацоўцы па кожнай спецыялізацыі рабочых праграм, індывідуальных заданняў. Гэта выклікана яшчэ і рознымі формамі, метадамі работы, бо публічная бібліятэка адрозніваецца ад навуковай, раённы Дом культуры — ад фірмы, фірма — ад аддзела культуры. Або яшчэ адзін прыклад: студэнты спецыялізацыі "менеджмент сацыякультурнай сферы" праходзяць практыку ў студыях тэлерадыёкампаніі Беларусі, у Беларускім інстытуце праблем культуры, Інстытуце турызму, акцыянерных таварыствах. Тут розныя характар працы, вынікі работы, таму патрэбна даваць кожнаму студэнту індывідуальнае заданне. Аналагічнае становішча па іншых спецыялізацыях. А індывідуальныя заданні дазваляюць канкрэтызаваць, дэталёва ўдакладніць праграму практыкі, улічваць умовы, асаблівасці, тэхналогіі работы баз практыкі.

Павышэнне эфектыўнасці практыкі залежыць ад мэтанакіраванай дзейнасці, арганічнага ўзаемадзеяння дэканатаў, кафедраў з базамі практыкі — лепшымі, часцей за ўсё вядучымі ўстановамі сацыякультурнай сферы, прафесійнымі, самадзейнымі мастацкімі калектывамі, якія маюць свае традыцыі, вопыт работы, творчы шлях станаўлення, развіцця. У навучальным годзе ў якасці баз практыкі выкарыстоўваюцца каля трохсот

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

устаноў культуры, навучальных устаноў, арганізацый культуры, мастацтва, што адпавядаюць мэтам і зместу практыкі. Сярод іх Нацыянальная бібліятэка Беларусі, бібліятэкі цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы г.Мінска, ВНУ, рэспубліканскія навукова-метадычныя бібліятэкі ведамстваў. Гэта Палацы, Дамы культуры, кінатэатры, упраўленні, аддзелы культуры, рэдакцыі тэлерадыёкампаніі Беларусі, акцыянерныя таварыствы, фірмы, што адносяцца да галіны культуры і інш. Студэнты факультэта мастацкай творчасці практыкуюцца ў мастацкіх калектывах: фальклорных ансамблях "Горлица", "Неруш", "Церніца", "Карагод", харавой капэле Дома настаўнікаў, камерных і народных харавых калектывах іншых устаноў, камерных і народных аркестравых калектывах, эстрадных аркестрах Дзяржаўнага цырка і Таварыства інвалідаў па зроку, духавым аркестры Беларускай ваеннай акругі.

Студэнты кафедры тэатральнай творчасці праходзяць практыку ў Беларускім тэатры імя Я.Купалы, Рускім драматычным тэатры імя М.Горкага, тэатрах музычнай камедыі, юнага гледача і інш.: прысутнічаюць на рэпетыцыях, вывучаюць працэс работы над пастаноўкай, удзельнічаюць у спектаклях.

Частка студэнтаў факультэта культуралогіі праходзіць практыку ва ўпраўленнях і аддзелах культуры. Практыка студэнтаў спецыяльнасці "сацыяльная педагогіка" пачынаецца на 1 курсе. Асноўны накірунак яе — рэабілітацыя асобы сродкамі мастацтва. Таму яна праходзіць у сем'ях, дзе ёсць дзеці-інваліды, што патрабуюць дапамогі ў арганізацыі вольнага часу. Студэнты спецыялізацыі рыхтуюць мерапрыемствы, прыцягваюць па магчымасці дзяцей розных узростаў. Так, навучэнцы прымалі ўдзел у дабрачынным кірмашы, прысвечаным Чарнобылю, у марафоне-96 "Чернобыльские колокола". У якасці баз практыкі выкарыстоўваюцца і пазашкольныя дзіцячыя ўстановы. У цэнтры "Вясёлка" студэнты ўдзельнічалі ў рэйдзе "Падлетак" сумесна з настаўнікамі, інспектарам міліцыі. У цэнтры рэабілітацыі "ЮНЕСКА-ЧАРНОБЫЛЬ" у Аксакаўшчыне група студэнтаў вяла выхаваўчую работу сярод ліквідатараў аварыі на ЧАЭС і жыхароў забруджаных раёнаў, якія знаходзіліся на аздараўленні.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Навучэнцы спецыялізацыі "рэжысура свят" прымаюць пастаянны ўдзел ва ўсіх масавых мерапрыемствах, што праводзяцца ў г.Мінску. Так, яны былі ўдзельнікамі свят народнай творчасці, Купалля, кірмашу, Дня Перамогі, выступалі ў ролі рэжысёраў, пастаноўшчыкаў, асістэнтаў-пастаноўшчыкаў і інш. Добрыя сувязі кафедра мае з Мінскім гарадскім упраўленнем культуры, цэнтрамі эстэтычнага выхавання, пазашкольнай работы г.Мінска, Палацам культуры і спорту чыгуначнікаў і іншымі ўстановамі.

Асноўныя базы практыкі факультэта бібліятэчна-інфармацыйных сістэм — гэта вядучыя бібліятэкі: Нацыянальная бібліятэка Беларусі, буйнейшыя галіновыя, бібліятэкі ВНУ, абласная бібліятэка імя А.С.Пушкіна, Прэзідэнцкая бібліятэка. У працэсе практыкі студэнты набываюць вопыт навукова-метадычнай, навукова-даследчай, арганізацыйнай работы ў бібліятэках. Па сутнасці, даведваюцца пра ўсе працэсы бібліятэчнай працы, выконваюць заданні кіраўнікоў базавых бібліятэк.

Студэнты спецыялізацыі "музеязнаўства" праходзяць практыку на базе Інстытута гісторыі АН Беларусі, Заслаўскага музея-запаведніка, музея М.Багдановіча. Іх практыка пачынаецца з другога курса, адбываецца як археалагічная на раскопках селішча X—XI стст., што знаходзіцца на р.Менка ў Мінскім раёне. У час яе студэнты вывучаюць методыку археалагічных палявых даследаванняў, займаюцца першапачатковай апрацоўкай знойдзеных археалагічных матэрыялаў. Раскопкі праводзяцца пад кіраўніцтвам вучоных-гісторыкаў Ю.Заяца, Г.Штыхава і іншых.

Асобныя студэнты факультэтаў мастацкай творчасці, культуралогіі, а з гэтага навучальнага года і факультэта бібліятэчна-інфармацыйных сістэм праходзяць педагагічную практыку. Гэта студэнты 4-5 курсаў па розных спецыяльнасцях народнай творчасці, тэатральнай творчасці, харавой музыкі, інструментальнай музыкі, харэаграфіі. Базамі такой практыкі з'яўляюцца адукацыйныя школы з музычным або эстэтычным ухілам, музычныя школы, школы мастацтваў, музычнае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вучылішча імя М.Глінкі, Мінскае вучылішча мастацтваў і іншыя навучальныя ўстановы.

Адзін з накірункаў работы па правядзенні практыкі ўяўляе падбор кіраўнікоў практыкі на базах. Часцей за ўсё гэта лепшыя супрацоўнікі вытворчых калектываў, што маюць вопыт работы, дапамагаюць моладзі спасцігаць тэхналогію працы, плённа ўплываюць на змест практыкі, увесь працэс навучання.

Нягледзячы ў цэлым на добры творчы кантакт з базамі практыкі, існуюць некаторыя праблемы. Раней работа Палацаў, Дамоў культуры, установ культуры іншых тыпаў задавальняла кафедры факультэта культуралогіі па ўсіх параметрах дзейнасці. Апошнія падыходы да падрыхтоўкі спецыялістаў, узнікненне новых спецыяльнасцей, спецыялізацый, спецыфіка работы названых установ не адпавядаюць сучасным патрабаванням. Установы культуры шукаюць формы, якія даюць прыбытак, займаюцца бізнесам, таму часта адмаўляюцца браць студэнтаў на практыку. У сувязі з гэтым узнікае неабходнасць пошуку новых баз практыкі, якія б адпавядалі зместу навучання. Адначасова з'явілася традыцыя накіроўваць студэнтаў ва ўстановы, што тыя знойдуць самі. Нявыезд студэнтаў на практыку ў вядучыя ўстановы культуры розных рэгіёнаў рэспублікі перапыняе паступленне новай, цікавай інфармацыі пра сучасную дзейнасць тых, для каго рыхтуюцца кадры, што збядняе змест навучання. Аддзелы культуры, бібліятэкі, музеі, Дамы культуры, у сваю чаргу, не інфармуюцца пра новыя спецыялізацыі Беларускага універсітэта культуры,а гэта зніжае ўзровень прафарыентацыйнай работы.

Няпростай з'яўляецца праблема тэрмінаў практыкі. Яна на ўсіх факультэтах і спецыялізацыях па працягласці розная, ад 3 да 15 тыдняў. На факультэце мастацкай творчасці студэнты 2-3 курсаў практыкуюцца на працягу семестра без адрыву ад заняткаў, а педагагічная практыка на 4 курсе працягваецца ўвесь навучальны год, на 5 курсе — семестр, адзін раз у тыдзень. Студэнты факультэта культуралогіі за перыяд навучання праходзяць практыку з адрывам ад заняткаў на працягу 26 тыдняў, факультэта мастацкай творчасці — на працягу 12



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тыдняў, факультэта бібліятэчна-інфармацыйных сістэм — на працягу 22 тыдняў.

Галоўным стрыжнем практыкі ўяўляецца яе змест, акрэслены праграмай спецыяльных дысцыплін, якія студэнты вывучаюць у працэсе навучання. На практыцы студэнты выконваюць розныя віды, формы работ, індывідуальныя заданні кіраўнікоў ад кафедры, ад базавай установы. Вынік жа, асабліва вытворчай практыкі студэнтаў 4-5 курсаў, уяўляе работа кожнага з іх над пастаноўкай спектакля, канцэртнага нумара, арганізацыяй свята, вечарыны, абрадавага свята, дзіцячага мерапрыемства і г.д. Студэнты, якія вучацца на факультэце мастацкай творчасці, свае інструментоўкі, аранжыроўкі музычных твораў увасабляюць у працы з творчым калектывам. Студэнты факультэта культуралогіі падчас пераддыпломнай практыкі праводзяць даследаванні, эксперыменты, якія з'яўляюцца асноўнай часткай дыпломных работ. Аналагічнае становішча бачым на выпускным курсе факультэта бібліятэчна-інфармацыйных сістэм. Там вынікі практыкі студэнты выкарыстоўваюць таксама пры напісанні дыпломных работ.

У мінулым навучальным годзе Беларускаму універсітэту культуры былі выдзелены сродкі для арганізацыі практыкі. Таму частка студэнтаў пад кіраўніцтвам прафесарска-выкладчыцкага саставу прайшла практыку за межамі г.Мінска.

У 1997/98 навучальным годзе ў рамках практыкі былі арганізаваны 4 навукова-творчыя фальклорныя экспедыцыі па зборы беларускага песеннага фальклору для паглыбленага вывучэння народнай спадчыны асобных рэгіёнаў рэспублікі. Так, праведзена навукова-творчая экспедыцыя ў Веткаўскі раён, в.Стаўбуны, пад кіраўніцтвам старшага выкладчыка Беларускага універсітэта культуры С.Ф.Война. Студэнты ўдзельнічалі ў абрадавым свяце "Пахаванне страды", якое праводзіцца ў некаторых раёнах Гомельшчыны. Паспяхова прайшла фальклорная экспедыцыя ў вёскі, найлепш у в.Сорагі Слуцкага раёна, студэнтаў спецыяльнасці "рэжысура фальклорнага тэатра" пад кіраўніцтвам дацэнта І.І.Сучкова. Навучэнцы правялі там свята "Купалле", паказалі прадстаўленні "Сказ аб багах

РЭПОЗІТОРЫЙ БГУКІ

крывіцкіх", "Расповяд пра Купалле", "Саўка ды Грышка", "Доля мая, доля" для жыхароў усяго Слуцкага раёна. Тады былі запісаны легенды, паданні пра мясцовыя капішчы, камяні, пагоркі, а таксама загадкі, дзіцячыя гульні, калыханкі, забаўлянкі, песні абрадавага, пазаабрадавага цыклаў. Адбылася фальклорная экспедыцыя студэнтаў першага, другога курсаў (16 чалавек) спецыялізацыі "харавая народная музыка" пад кіраўніцтвам старшага выкладчыка А.В.Клеванца ў в.Дрычын Асіповіцкага раёна, калі студэнты запісвалі беларускія народныя песні, знаёміліся са святамі, абрадамі Асіповіцкага раёна.

Кафедра народных рамёстваў арганізавала экспедыцыю па маршруце Ракаў—Івянец—Мір—Нясвіж—Радашковічы для вывучэння дзейнасці народных майстроў, набыцця іх твораў (кіраўнік старшы выкладчык Т.І.Васюк). Той жа кафедрай быў арганізаваны летні пленэр-практыкум на базе Мірскага СПТВ №234 Карэліцкага раёна, куды выехала 29 студэнтаў першага курса пад кіраўніцтвам дацэнта У.І.Рынкевіча. Вынікам пленэра-практыкуму стала выстава работ студэнтаў.

Кафедра народна-інструментальнай творчасці арганізавала выезд фальклорнага гурту "Баламуты" ў Калінкавіцкі раён Гомельскай вобласці з мэтай вывучэння народнай спадчыны, удзелу ў свяце (кіраўнік дацэнт В.І.Трамбіцкая).

З 27 чэрвеня па 10 ліпеня 1997 года арганізавана археалагічная практыка студэнтаў 208 групы (21 студэнт) спецыяльнасці "музеязнаўства" ў в.Гарадзішча для раскопак селішча на р.Менка.

Студэнты 105 і 308 груп (гэта 38 студэнтаў) выязджалі ў Навагрудак, Нясвіж, Мір з мэтай вывучэння гістарычнай і культурнай спадчыны.

Усяго ў фальклорных экспедыцыях удзельнічалі 56 студэнтаў і выкладчыкаў. Выязджалі ў рэгіёны Беларусі на экскурсіі ў час практыкі 78 студэнтаў.

Асаблівую ўвагу выпускаючых кафедраў усіх факультэтаў трэба звярнуць на вытворчую і пераддыпломную практыку студэнтаў выпускнога курса, якіх рыхтуюць для выканання складаных вытворчых працэсаў. На факультэтах культуралогіі,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бібліятэчна-інфармацыйных сістэм практыка спалучае выкананне тэарэтычных, практычных заданняў, правядзенне навуковых даследаванняў, апрабацыю, укараненне новых форм і метадаў работы. На спецыялізацыях "менеджмент сацыяльна-культурнай сферы", "сацыяльная педагогіка", "бібліятэказнаўства і бібліяграфія" на падставе даследаванняў і вопыту работы ўстановы—базы практыкі, сабраных матэрыялаў студэнты пішуць дыпломныя работы. Дыпломныя работы студэнтаў іншых кафедраў — пастановачныя планы, інфармацыйныя, тэарэтычныя абгрунтаванні свят, відовішчаў і інш. Асноўная мэта пераддыпломнай практыкі — сістэматызацыя матэрыялаў для стварэння дыпломнага праекта.

Работа з навучэнцамі магістратуры ў гэтым годзе паказала, што на факультэце мастацкай творчасці неабходна дэталёва прадумаць форму справаздачы па выніках практыкі. Можа, гэта будзе артыкул, агляд, іншая форма пісьмовай работы (акрамя, зразумела, практычнай работы з мастацкім калектывам). Такая пісьмовая работа павінна паказваць здольнасці выпускніка для таго, каб весці навукова-даследчую работу. Студэнтам гэтага факультэта складана працаваць над магістэрскай дысертацыяй, часу для яе заканчэння мала — усяго адзін год. Калі студэнты іншых факультэтаў пры навучанні ў магістратуры працягваюць распрацоўваць раней выбраную тэму, дык студэнтам факультэта мастацкай творчасці трэба за год пачаць і завяршыць сваю навуковую работу, правесці даследаванні, апрабіраваць прапановы.

Вялікая роля ў павышэнні якасці вытворчай практыкі належыць кантролю, падвядзенню яе вынікаў. На кафедрах выкарыстоўваюцца такія формы кантролю: індывідуальныя гутаркі з кіраўнікамі практыкі ад базавай установы, афармленне, праверка дзённікаў альбо сшыткаў, што фіксуюць вынікі працы, зробленай у час практыкі. Больш грунтоўна падводзяць вынікі факультэты бібліятэчна-інфармацыйных сістэм, мастацкай творчасці пасля педагагічнай практыкі. На абмеркаванні прысутнічаюць супрацоўнікі бібліятэк, выкладчыкі дзіцячай музычнай школы №11 г.Мінска. Яны выказваюць уражанні ад



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адносін студэнтаў да выканання заданняў, праграмы практыкі. Вынікі педагагічнай практыкі праводзяцца, па-першае, у класе, дзе студэнты вядуць адкрытыя ўрокі, якія наведвае група выкладчыкаў школы і прадстаўнік кафедры; па-другое, на кафедры перад камісіяй. На другіх кафедрах робяць справаздачы па абмеркаванні праведзенай работы. Абмяркоўваюцца сцэнарныя планы, рэжысёрскія распрацоўкі, пастановачныя планы і інш. Пастаянны кантроль за ходам практыкі, дапамога, кансультацыі пры выкананні заданняў, вырашэнне шэрагу прыватных пытанняў дазваляюць дыферэнцыравана падыходзіць да студэнтаў, улічваць асаблівасці базы практыкі.

Але ў арганізацыі кантролю і падвядзенні вынікаў практыкі ёсць недахопы. Так, не ўсе выкладчыкі часта наведваюць студэнтаў на базах практыкі, не кантралююць і не дапамагаюць выконваць індывідуальныя заданні. Вынікі практыкі на кафедрах падводзяцца несвоечасова. Згодна з існуючым палажэннем студэнт-практыкант абавязаны скласці пісьмовую справаздачу, аформіць дзённік, падпісаць яго ў кіраўніка базы практыкі, пасля здаць дыферэнцыраваны залік камісіі, зацверджанай загадчыкам кафедры. Пры ацэнцы работы студэнта на базе практыкі ўлічваецца і характарыстыка, якую даў кіраўнік базавай установы. Неабходна кафедрам дастаткова поўна, аб'ектыўна праводзіць глыбокі, усебаковы аналіз вынікаў практыкі.

Патрэбна ўзнавіць правядзенне выніковых канферэнцый, на якіх канкрэтныя прыклады раскрывалі б творчыя адносіны кожнага студэнта, групы да накірункаў работы на базах практыкі, выяўлялі б недахопы ў тэарэтычнай і метадычнай падрыхтоўцы студэнтаў. Мэтазгодна ў будучым абагульніць вопыт некаторых кафедраў, распрацаваць метадычныя рэкамендацыі на тэмы: "Правядзенне навукова-даследчай работы ў перыяд вытворчай практыкі", "Складанне скразных праграм вытворчай практыкі: праблемы і рашэнні", "Арганізацыя кантролю ў час практыкі студэнтаў".

Крытэрыем эфектыўнасці работы з'яўляецца стаўленне да вытворчай практыкі кожнага з выкладчыкаў, якім даручана



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кіраўніцтва практыкай. Вялікая частка іх выконвае свае абавязкі на высокім метадычным узроўні: выкладчыкі кафедраў менеджменту, сацыяльнай педагогікі, народна-інструментальнай творчасці, бібліятэказнаўства, бібліяграфіі і дакументазнаўства, беларускай і сусветнай мастацкай культуры і інш. Яны добрасумленна аказваюць дапамогу студэнтам у авалоданні прафесійнымі навыкамі.

Малады спецыяліст сёння — гэта чалавек творчага пошуку. Найбольшага поспеху дасягае той, хто не проста ведае тэхналогію, прадумана арганізуе працу, але яшчэ і можа з усёй разнастайнасці дасягненняў навукі, перадавога вопыту выбіраць самае каштоўнае, тое, што больш за ўсё адпавядае ўмовам канкрэтнага працоўнага калектыву. Наша задача — дапамагаць будучым спецыялістам здабываць патрэбныя ім веды і навыкі падчас вытворчай практыкі.

**Караткевіч А.А.**, выкладчык

## АСНОЎНЫЯ НАКІРУНКІ ВЫТВОРЧАЙ ПРАКТЫКІ СТУДЭНТАЎ ФАКУЛЬТЭТА МАСТАЦКАЙ ТВОРЧАСЦІ

На факультэце мастацкай творчасці выкарыстоўваюцца наступныя базы правядзення вытворчай практыкі: прафесійныя калектывы, мастацкія калектывы буйных клубных устаноў, вучылішчы мастацтваў, ліцэі, музычныя школы, сярэднія школы з музычна-эстэтычным ухілам, студэнцкія, падлеткавыя клубы, студыі бальных танцаў і інш. У апошні час практыка адбывалася ў 72 творчых калектывах.

Асаблівую ўвагу пры размеркаванні студэнтаў на практыку ўдзяляюць дзіцячым мастацкім калектывам. Сёння існуе патрэба ў дыпламаваных спецыялістах, здольных кіраваць дзіцячай самадзейнасцю, весці ў школах, пазашкольных установах эстэтычную выхаваўчую работу. Праходжанне пераддыпломнай вытворчай практыкі ў дзіцячых мастацкіх калектывах своечасова рыхтуе студэнтаў да самастойнай работы пасля заканчэння ВНУ. Праца ў дзіцячых калектывах узбройвае практыкантаў трывалымі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ